ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне
Баранавіцкага гарадскога
выканаўчага камітэта
06.02.2025 № 315

ПАЛАЖЭННЕ
аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу эскізных праектаў манументальнай скульптуры «Баранавічы - горад працоўнай славы. 1941 – 1945 гг.»

1. Мэтай конкурсу эскізных праектаў манументальнай скульптуры «Баранавічы - горад працоўнай славы. 1941 - 1945 гг.» (далей – конкурс) з’яўляецца пошук найбольш выразнага мастацкага адлюстравання з мэтай увекавечання подзвігу масавага працоўнага геразму і самаадданасці працаўнікоў тылу ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941 - 1945 гг. на тэрыторыі г. Баранавічы.

2. Арганізатарам конкурсу з’яўляецца гарвыканкам.

3. Удзельнікамі конкурсу могуць быць скульптары, архітэктары, кавалі, якія маюць адпаведную прафесійную адукацыю.

4. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца на афіцыйным сайце гарвыканкама, у афіцыйных сродках масавай інфармацыі, змяшчае звесткі аб конкурсе, яго ўмовах, крытэрыях і парадку ацэнкі прадстаўленых удзельнікамі матэрыялаў, парадку і тэрмінах абвяшчэння вынікаў конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

5. Конкурсныя матэрыялы павінны быць прадстаўлены ў адпаведнасці з пунктам 14 Палажэння аб парадку стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2008 г. № 1372 (тлумачальная запіска з абгрунтаваннем прапануемага праекта і разлікам яго прыкладнага кошту, генеральны план у маштабе 1:500, праектнае горадабудаўнічае рашэнне прасторы з памятным знакам ці з малой архітэктурнай формай, візуалізацыю архітэктурна-пластычнага рашэння твора манументальнага мастацтва і мадэль памятнага знака ці малой архітэктурнай формы ў маштабе не менш за 1:10). Эскізны праект павінен быць прадстаўлены на цвёрдым планшэце памерам 1,0 х 1,0 м.

6. Кампазіцыйнае і пластычнае выкананне манументальнай скульптура «Баранавічы - горад працоўнай славы. 1941 - 1945 гг.» павінна быць у выглядзе стэлы, вытрымана ў найлепшых традыцыях класічнага і нацыянальнага манументальнага мастацтва. Стэла

вышынею не больш за 15 метраў павінна быць усталявана на пляцоўцы каля будынка вул. Савецкая, 79 з улікам візуальнага ўспрыняцця помніка з розных бакоў.

7. Для прыняцця ўдзелу ў конкурсе ў тэрмін па 26 лютага 2025 г. уключна не пазней 17.00 падаецца заяўка па форме згодна з дадаткам да дадзенага Палажэння і конкурсныя матэрыялы на адрас: 225409, г. Баранавічы, вул. Горкага, 20, каб. 217, кантактны нумар +375 163 60 32 62.

8. У мэтах захавання ананімнасці аўтараў конкурсныя матэрыялы прадстаўляюцца ўдзельнікамі пад чатырохзначным нумарам, які ўказваецца аўтарамі на ўсіх матэрыялах у левым верхнім вугле, а таксама на канверце ўдзельніка конкурсу.

У запячатаны канверт удзельніка конкурсу ўкладваюцца інфармацыйны ліст, які змяшчае прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку (калі такое маецца), а таксама адрас і кантактны нумар тэлефона удзельніка альбо калектыву ўдзельнікаў конкурсу.

Пры парушэнні ўмоў конкурсу і правіл афармлення і прадстаўлення конкурсных матэрыялаў праект не разглядаецца.

9. Конкурсныя матэрыялы разглядаюцца журы на закрытым паседжанні не пазней 10 сакавіка 2025 г.

Склад журы зацвярджаецца рашэннем гарвыканкама.

10. Рашэнне прымаецца ў прысутнасці не менш паловы складу журы адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў прысутных. Пры роўнай колькасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні журы з’яўляецца вырашальным. Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісваецца ўсімі членамі журы, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

11. Крытэрыі ацэнкі эскізных праектаў:

адпаведнасць умовам конкурсу;

высокі прафесійны ўзровень;

выкарыстанне арыгінальнага рашэння;

адлюстраванне найбольш выразнага вобраза з улікам гістарычнай дакладнасці;

эканамічнасць праектнага рашэння.

12. Канверты ўдзельнікаў конкурсу распячатваюцца пасля вынясення рашэння журы па выніках конкурсу.

13. Рашэннем журы вызначаецца эскізны праект, які заняў 1-е месца, і пераможца (аўтар гэтага эскізнага праекта).

14. Вынікі конкурсу публікуюцца ў тыднёвы тэрмін пасля вынясення рашэння журы на афіцыйным сайце гарвыканкама.

15. Пераможца конкурсу атрымлівае права на стварэнне манументальнай скульптуры «Баранавічы - горад працоўнай славы. 1941 - 1945 гг.» у адпаведнасці з заканадаўствам.

16. Паштовыя і іншыя выдаткі ўдзельнікаў конкурсу аплачваюцца за іх кошт.

17. Пасля заканчэння работы журы конкурсныя матэрыялы вяртаюцца ўсім удзельнікам конкурсу.